# ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ПАРТРЭТ МІНІСТРА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР А. Е. ГУРЫНОВІЧА: УРАЖАННІ І РОЗДУМЫ

***У. Е. Снапкоўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, ulsnap44@inbox.ru*

У артыкуле адлюстраваны накіды да дыпламатычнага партрэта міністра замежных спраў БССР А. Е. Гурыновіча (1924–1999), які ўзначальваў знешнепалітычнае ведамства ў 1966–1990 гг. Аўтар характарызуе яго палітычную і навуковую спадчыну, адметнасці дыпламатычнага стылю, якія вынікалі са статуса саюзнай рэспублікі ў савецкім знешнепалітычным механізме, змен у міжнароднай палітыцы, асабістага характару дыпламата. Аўтар дзеліцца асабістымі ўражаннямі і роздумамі аб сустрэчах з А. Гурыновічам, паказвае атмасферу адносін паміж беларускімі дыпламатамі і вучонымі.

***Ключавыя словы***: А. Е. Гурыновіч; Беларуская ССР; Міністэрства замежных спраў; Арганізацыя Аб’яднаных Нацый; палітыка перабудовы.

# DIPLOMATIC PORTRAIT OF THE MINISTER OF FOREIGN AFFAIRS OF THE BYELORUSSIAN SSR A. E. GURYNOVICH: IMPRESSIONS AND THOUGHTS

***U. E. Snapkouski***

*Belarusian State University, Niezalieznasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus*

The article presents sketches for the diplomatic portrait of the Minister of Foreign Affairs of the BSSR A.E. Gurynovich (1924–1999), who headed the Ministry in 1966–1990. The author characterizes his political and scientific heritage, features of the diplomatic style, due to the status of the union republic in the Soviet foreign policy mechanism, changes in international politics, the personal character of the diplomat. The author shares his personal impressions and thoughts on meetings with A. Gurynovich, shows the atmosphere of relationship between Belarusian diplomats and scientists.

***Keywords****:* A. E. Gurynovich; Byelorussian SSR; Ministry of Foreign Affairs; United Nations; perestroika.

Пасля вяртання ў 1944 г. Беларускай ССР, як і іншым саюзным рэспублікам, знешнепалітычных паўнамоцтваў, Міністэрства замежных спраў у Мінску на працягу 46 год узначальвалі два чалавекі – Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў (1944–1966 гг.) і Анатоль Емяльянавіч Гурыновіч (1966–1990 гг.). Такой стабільнасці не было ва Украінскай ССР, дзе міністры мяняліся даволі часта, як і ў саюзным міністэрстве, нягледзячы

на рэкорд, пастаўлены А.А. Грамыкам (1957–1985 гг.). Тлумачэнні, чаму і як два беларускія міністры падзялілі паміж сабой амаль паўвекавы перыяд навейшай гісторыі Беларусі, СССР і міжнародных адносін, які амаль цалкам супадае з дзесяцігоддзямі «халоднай вайны», могуць быць рознымі. Напэўна, абодва падыходзілі кіраўніцтву ў Маскве і Мінску, і таму яно не спяшалася іх мяняць. К.В. Кісялёва адправілі ў адстаўку ў яшчэ не старым 63-гадовым узросце і гэта было звязана хутчэй за ўсё з пераменамі ў саюзным і рэспубліканскім кіраўніцтве: у 1964 г. да ўлады прыйшоў Л.І. Брэжнеў, у 1965 г. – П.М. Машэраў. Яшчэ адной прычынай можна было лічыць невысокі статус міністра замежных спраў у БССР, на які не было шмат ахвотнікаў з ліку рэспубліканскай наменклатуры.

Наступнік А. Е. Гурыновіча Пётр Кузьміч Краўчанка, які быў выбраны на пасаду міністра Вярхоўным Саветам БССР у ліпені 1990 г. (дарэчы выбарным шляхам гэта адбылося ўпершыню ў гісторыі і ў апошні раз), піша ва ўспамінах, як адмовіўся ад прапановы прэм'ер-міністра Вячаслава Францавіча Кебіча заняць пасаду яго намесніка і нават першага віце-прэм'ера, чым яго моцна раззлаваў. Калі Краўчанка сказаў пра сваю мару стаць міністрам замежных спраў, стары і вопытны наменклатуршчык В.Ф. Кебіч у некалькіх рэзкіх сказах апісаў, чым было МЗС у вачах і думках рэспубліканскага партыйнага кіраўніцтва. «Ты же знаешь, что никакого Министерства иностранных дел у нас нет... На самом деле это просто синекура, несколько чиновников просиживают штаны, средь бела дня играя в шахматы. ... Это же не министерство, а управленческий аппендикс!.. Тихая гавань...» [1, с. 27]. Размова была ўвёсну 1990 г. П.К. Краўчанка адказаў: «Через год МИД будет одним из самых важных и беспокойных ведомств в республике. Это не тихая гавань, а главный инструмент политического назначения!» [1, с. 28]. Гэта абяцанне і рэалістычны прагноз хутка спраўдзіліся, калі новы і малады міністр удыхнуў свежае паветра ў працу знешнепалітычнага ведамства, якое пайшло ў авангардзе гістарычнага пераходу рэспублікі ад фармальнага суверэнітэту да рэальнай незалежнасці.

К.В. Кісялёў і А.Е. Гурыновіч мелі розны палітычны і прафесійны досвед, калі занялі пасаду міністра. Першы нават быў старшынёй СНК БССР у 1938–1940 гг., але не меў дыпламатычнай адукацыі і не ведаў добра англійскай мовы. Другі закончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі і Вышэйшую дыпламатычную школу Міністэрства замежных спраў СССР і быў накіраваны на працу ў Мінск. У 1950–60-я гады (да адстаўкі К. Кісялёва) яны працавалі разам, і ў апошнія гады А. Е. Гурыновіч быў яго намеснікам. Паводле палітычнай вагі і значэння ў асяроддзі рэспубліканскай наменклатуры К. В. Кісялёў пераўзыходзіў

свайго пераемніка. Да 1958 г. ён сумяшчаў пасаду міністра з пасадай намесніка старшыні Савета Міністраў БССР. Кісялёў узначаліў міністэрства ў часы, калі яно вызначала (і рабіла гэта даволі выразна) сваё месца сярод трох савецкіх дэлегацый у ААН, як і ўвогуле сярод саюзнага і двух рэспубліканскіх міністэрстваў. У беларускай літаратуры апісаны смелыя ініцыятывы міністра, як і яго неардынарныя ўчынкі на сесіях Генеральнай Асамблеі і Парыжскай мірнай канферэнцыі 1946 г. [2, с. 366–367; 3, с. 81–82, 86–88, 165–166] Асобны сюжэт – гэта паездка К. В. Кісялёва ў Маскву ў 1952 г., дзе ён дабіўся сустрэчы з І.В. Сталіным, каб вызваліць арыштаваных супрацоўнікаў беларускага МЗС. А. Гурыновіч можна сказаць таксама не быў з робкага дзесятка, прайшоўшы партызанскую школу ў Беларусі ў гады вайны. Але час яго кіраўніцтва міністэрствам прыпаў на доўгія гады «застою» і крыху «перабудовы», калі беларускі МЗС ужо ўвайшоў у наезджаную каляіну выпрабаванага атрада савецкай дыпламатыі. Пра нейкія неардынарныя ўчынкі А. Гурыновіча даследчыкам невядома. Гэтаму не спрыялі ні час (хаця гады перабудовы адкрылі перад мінскім МЗС новыя магчымасці), ні практыка ўжо жорстка ўсталяваных адносін паміж саюзным і рэспубліканскім міністэрствамі, ні спакойны, разважлівы характар самога міністра.

У адрозненні ад К. Кісялёва, які пакінуў даволі цікавыя для свайго часу мемуары, А. Гурыновіч успамінаў не напісаў, як і нейкіх біяграфічных нататак. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь змяшчае фонд К. Кісялёва з дзясяткамі цікавых фотаздымкаў. Пра архіўную спадчыну А. Гурыновіча нічога не вядома: напэўна, яе няма. У 1964 г. у Маскве выйшла кніга «Белорусская ССР на международной арене», падрыхтаваная калектывам рэспубліканскага МЗС пад рэдакцыяй К. Кісялёва. Вядомы шэраг яго артыкулаў пра дзейнасць БССР у ААН у саюзным і рэспубліканскім друку.

Творчая спадчына А.Гурыновіча не такая багатая і яркая. Гэта брашура пра дзейнасць БССР у ААН (1982 г.), якая ахоплівае яго міністэрскі перыяд працы [4]. Другая брашура – гэта ротапрынтнае выданне таварыства «Веды» ў сааўтарстве [5]. У 1986 г. выдавецтва «Беларусь» выпусціла зборнік дакументаў і матэрыялаў аб удзеле БССР у 40-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН з вялікім уступным артыкулам міністра [6]. Аўтар адгукнуўся рэцэнзіяй на гэту працу [7]. Апошняя прыкметная публікацыя Гурыновіча – гэта артыкул у маскоўскім часопісе «Международная жизнь» (1988 г.) пад назвай «Дипломатия Белоруссии» [8]. Слабая актыўнасць у публічнай сферы дае падставы для заключэння, што міністр не любіў ці не жадаў афішыраваць сваю службовую

дзейнасць, як і працу ўсяго МЗС у выглядзе нейкіх аналітычных, калі гэты тэрмін падыходзіць да таго часу, артыкулаў ці больш грунтоўных публікацый. Яго ўкраінскія калегі, якія займалі пасады значна карацейшы час, пакінулі больш прыкметныя публікацыі. З другога боку, Гурыновіч рэгулярна выступаў у рэспубліканскіх газетах («Советская Белоруссия», «Звязда») са справаздачамі пра ўдзел беларускіх дэлегацый у сесіях Генеральнай Асамблеі і іншых органаў ААН і спецыялізаваных устаноў. Ён неаднаразова рабіў выступы ў Інстытуце гісторыі АН БССР, дзе ў свой час працаваў аўтар гэтых радкоў і які прысутнічаў на яго выступленнях.

П. Краўчанка, успамінаючы пра сваё прадстаўленне калектыву МЗС з боку В. Кебіча, згадвае пра «халоднае, грабавое маўчанне» супрацоўнікаў міністэрства [1, с. 44]. Пры передачы спраў А.Гурыновіч пакінуў яму ў сейфе адзіны дакумент – палажэнне аб Міністэрстве замежных спраў БССР, зацверджанае ў 1988 г. Нейкіх сакрэтных матэрыялаў ці дасье ў сейфе міністра не было, і, паводле слоў Краўчанкі, ніколі не бывала. Пазбягаючы негатыўнай ацэнкі дзейнасці асабіста Гурыновіча, якога новы міністр узяў да сябе саветнікам, П. Краўчанка паўтарае тэзіс аб тым, што «белорусского МИДа действительно не существовало. Все вопросы внешней политики решались в Москве» [1, с. 45].

Такое шчырае і разам з тым крыўднае для БССР і УССР прызнанне мог зрабіць толькі палітык, які прыйшоў у дыпламатыю звонку і кім сапраўды быў партыйны работнік і нацыянал-камуніст П. Краўчанка. Для супрацоўнікаў МЗС гэта быў даўно ўсталяваны і непахісны парадак рэчаў. Аўтар у публікацыях з пачатку 1990-х гг. праводзіў думку пра тое, што ў Беларускай ССР, як і ва УССР, не было сваёй «знешняй палітыкі», замест якой існаваў тэрмін «знешнепалітычная дзейнасць рэспублікі», замацаваны ў Канстытуцыі БССР 1978 г. Тое ж самае можна сказаць і пра дыпламатыю. У савецкі час не было дыпламатыі Беларусі, а замест яе быў выпрацаваны тэрмін «рэспубліканскі атрад савецкай дыпламатыі» ці савецкай дыпламатычнай службы [3, с. 206–226 і інш.].

П. Краўчанка, бяручы ў двукоссі тэрмін «знешняя палітыка» савецкай Беларусі, адзначае, што яна абмяжоўвалася выключна членствам у ААН, дзе, аднак, дэлегацыі БССР і УССР разглядаліся як прысцяжныя да дэлегацыі СССР. Роля беларускай дэлегацыі заключалася ў тым, каб празандзіраваць пазіцыю ЗША, паколькі яна па алфавітным спісе выступала на Генеральнай Асамблеі адной з першых. Прааналізаваўшы рэакцыю США і іншых дзяржаў, савецкая дэлегацыя магла падрыхтаваць больш аргументаваную пазіцыю. Фактар і лозунгі антыімперыялістычнай барацьбы, актыўна працавалі з дыпламатамі афра-азіяцкіх краін, у той час

як саюзная дэлегацыя займалася «больш сур'ёзнымі» пытаннямі міжнароднай бяспекі ці правоў чалавека [1, с. 45].

П. Краўчанка падкрэслівае важнае значэнне асабістых кантактаў А. Гурыновіча з шэрагам дыпламатаў краін «трэццяга свету», якія той перадаў яму. Найбольш каштоўнымі сталі даўнія адносіны Гурыновіча з перуанскім дыпламатам, пазней Генеральным сакратаром ААН Х. Перэсам дэ Куэльярам, які штогод наведваў беларускае прадстаўніцтва ў Нью-Ёрку па запрашэнні беларускага міністра [1, с. 45–46]. Дзякуючы ў тым ліку прыязным адносінам з А.Гурыновічам, Х. Перэс дэ Куэльяр наведаў Мінск з трохдзённым афіцыйным візітам у чэрвені 1987 г.

Я двойчы меў асабістыя сустрэчы з Анатолем Емяльянавічам, падчас якіх адбываліся размовы, і яны не былі кароткія. Першая адбылася недзе ў пачатку 1985 г. у кабінеце міністра ў былым будынку міністэрства на плошчы Леніна. Нагодай стала рэцэнзаванне маёй працы «Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.)». Гэта была абавязковая практыка тых часоў – кнігі аб знешнепалітычнай дзейнасці БССР павінны былі атрымаць дабро ў МЗС. Я ў той час працаваў вучоным сакратаром Аддзялення грамадскіх навук АН БССР і адначасова старшым навуковым супрацоўнікам у аддзеле замежных сувязей БССР акадэмічнага Інстытута гісторыі. Пра працу аддзела, публікацыі яго супрацоўнікаў міністр, канешне, ведаў, бо гэта было адзінае ў рэспубліцы навуковае падраздзяленне, якое займалася даследаваннем знешнепалітычнай дзейнасці БССР і прама ці ўскосна закранала пытанні працы МЗС. Падчас гутаркі А.Гурыновіч пазітыўна ацаніў тэкст рукапісу і зрабіў некалькі змястоўных заўваг, каб аўтар мог больш дакладна паказаць працу беларускіх дэлегацый у ААН. Напрыканцы сустрэчы міністр пазнаёміў мяне са сваім памочнікам, маладым дыпламатам, выпускніком Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін С. М. Мартынавым, будучым міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь. Пазней міністэрства прадставіла ў выдавецтва рэцэнзію за подпісам С. Мартынава, што было адлюстравана ў падтытуле выдадзенай кнігі [9]. Атмасфера ў МЗС была спакойнай, міністра падчас гутаркі ніхто не турбаваў і ён удзяліў добразычлівую ўвагу маладому навукоўцу. Кніга выйшла ў свет да 40-годдзя ААН і, як я пазней ўстанавіў, вывучаючы Архіў беларускага МЗС, пра яе неаднаразова згадвалі ў справаздачах міністэрства ў Сакратарыят ААН у сувязі з мерапрыемствамі, прысвечанымі юбілейнай гадавіне ААН.

Другі раз я наведаў МЗС у снежні 1991 г. ці пачатку 1992 г., калі атрымаў дазвол на працу з дакументамі аб дзейнасці беларускіх дэлегацый у ААН для падрыхтоўкі доктарскай дысертацыі. Атмасфера ў міністэрстве было ўжо іншай. «Ціхай гавані» яна зусім не нагадвала.

Часам я адчуваў пэўнае незадавальненне супрацоўніцы, якая мяне абслугоўвала, бо я сапраўды перашкаджаў напружанай працы супрацоўнікаў. Памятаю адну дэталь, звязаную з міжнародным прызнаннем нашай незалежнасці. Супрацоўнікі скардзіліся, што не хапае дэфіцытнай паперы для факса, бо дзень і ноч ішлі паведамленні аб прызнанні краіны і ўстанаўленні з ёй дыпламатычных адносін.

Другая і апошняя сустрэча з А.Гурыновічам адбылася недзе на рубяжы 1992 і 1993 гг. Ён працаваў саветнікам новага міністра П. Краўчанкі і яго папрасілі даць водгук на рукапіс маёй манаграфіі «Путь Беларуси в ООН». Тэкст быў напісаны з новых метадалагічных пазіцый, прадыктаваных духам «перабудовы», а адной з галоўных высноў было абгрунтаванае матэрыяламі даследавання заключэнне, што ўключэнне дзвюх саюзных рэспублік у склад першапачатковых дзяржаў-членаў ААН з'явілася праявай сталінскай дыпламатыі, накіраванай на пашырэнне прадстаўніцтва саюзных рэспублік і ўсяго СССР на міжнароднай арэне. Гутарка праходзіла ў будынку Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, куды мяне запрасіў былы міністр. Гаворка так ці інакш вярталася да распаду СССР і звязаным з гэтым абвяшчэннем незалежнасці Беларусі, чым ён быў незадаволены, хаця гэта моцна не падкрэсліваў. З тэкста рукапісу, як можна меркаваць, ён даведаўся шмат для сябе новага, аб чым раней не пісалася ў савецкай навуковай літаратуры. Для яго, як і большасці дыпламатаў савецкай школы, былі не зусім ці цалкам непрымальныя вывады пра пасіўную ролю Беларусі і Украіны ў працэсе ўваходжання ў склад ААН, праявы сталінскай вялікадзяржаўнай палітыкі. Але сказана аб гэтым мне было вельмі далікатна. Анатоль Емяльянавіч прапанаваў змякчыць занадта рэзкія на яго погляд фармулёўкі, я абяцаў па магчымасці ўлічыць выказанныя заўвагі. Ён не даў ніякага пісьмовага заключэння, напэўна, не пажадаўшы закрываць дарогу працы. Мяркую, што сваю думку ён перадаў памочніку міністра У. Р. Шчаснаму, які курыраваў мой рукапіс. Крыху пазней я атрымаў рэзка абмоўную рэцэнзію начальніка аддзела міжнародных арганізацый МЗС В. М. Фісенкі, якая захавалася ў маім архіве. Аўтар быў фактычна абвінавачаны ў непатрыятычнай, зневажальнай для Беларусі пазіцыі. Рэкамендацыі да друку міністэрства не дало. Праўда, часы меняліся. Пасля дапрацоўкі і зняцця занадта катэгарычных ацэнак МЗС дало рэкамендацыю да друку за подпісам С. С. Агурцова, і ў пачатку 1994 г. кніга ўбачыла свет [10].

У абодвух выпадках А. Гурыновіч праявіў сабе як прафесіянальны дыпламат і добразычлівы да вучонага-гісторыка чалавек, які дбаў пра імідж рэспублікі і свайго ведамства. У першым выпадку гэта было лягчэй

зрабіць, бо прадстаўленая праца адпавядала тагачасным канонам асвятлення дзейнасці БССР у ААН. У другім выпадку новы рукапіс даваў зусім іншую, нязвыклую карціну шляху Беларусі ў ААН. Вынікі і наступствы ўключэння БССР у лік стваральнікаў арганізацыі, яе незайздросную ролю дадатковага голаса для саюзнай дэлегацыі міністр замежных спраў адчуваў на працягу 30 гадоў дыпламатычнай працы. Яму даводзілася неаднаразова сустракацца з заявамі заходніх дыпламатаў і палітыкаў аб выпадковасці ўключэння дзвюх рэспублік у ААН, як і з прапановамі выключыць іх з яе складу [11, с. 350–359; 12, л. 34–35]. Мой тэкст так ці інакш ішоў у рэчышчы такіх падыходаў, хаця і адпавядаў гістарычнай праўдзе. У гэтым пераконваюся і сёння, калі асноўныя палажэнні кнігі «Путь Беларуси в ООН» знайшлі апрабацыю і развіццё ў навучальных дапаможніках, навуковых артыкулах і энцыклапедыях.

Беларускі дыпламатычны стыль 1970–80-х гг. найбольш яскрава выяўляла фігура А. Гурыновіча. У яго бытнасць у краіне і рэспубліцы было прынята некалькі важных праграмна-стратэгічных дакументаў (Канстытуцыя СССР і БССР, Палажэнне аб МЗС БССР, пастанова ЦК КПБ «Аб удзеле міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі ў дзейнасці міжнародных арганізацый сістэмы ААН»). У прыватнасці, пастанова ЦК КПБ упершыню комплексна разгледзела дзейнасць органаў дзяржаўнага кіравання ў міжнародных арганізацыях, адзначыўшы дасягненні, недахопы і шляхі іх выпраўлення. Яна прагматычна нацэльвала МЗС і іншыя міністэрствы і ведамствы рэспублікі на вывучэнне і ўкараненне ў народную гаспадарку перадавога замежнага вопыту, прасоўванне савецкіх спецыялістаў на работу ў сакратарыяты міжнародных арганізацый, больш глыбокі аналіз удзелу беларускіх дэлегацый у розных сесіях і канферэнцыях [13, с. 14–19]. Палажэнне аб МЗС ставіла дзейнасць міністэрства на прававую аснову, легалізаваўшы яго статус як састаўной часткі савецкай дыпламатычнай службы [13, с. 271–276]. Новым словам у палітычным лексіконе быў тэрмін «дыпламатыя Беларусі», упершыню ўжыты міністрам у 1988 г. Паводле слоў А.Гурыновіча, намаганні беларускай дыпламатыі былі падпарадкаваны рэалізацыі галоўных мэт і напрамкаў міжнароднай палітыкі КПСС і Савецкай дзяржавы [8, с. 70].

У гады перабудовы міністр пазбягаў крытычных ацэнак узаемаадносін рэспублікі з цэнтрам і стрымана ўжываў рыторыку «новага мыслення». Ён падкрэсліваў гонар беларускіх дыпламатаў за дасягненні сваёй Радзімы, іх аптымізм і веру ў будучыню, у тым ліку ў перавагі сацыялізму. Сфамуляванае ім маральна-палітычнае крэда беларускага МЗС складалася ў паслядоўнасці і прынцыповасці, нецярпімасці да несправядлівасці, аргументаваным адпоры палітычным і дыпламатычным

сапернікам [8, с. 70]. Пры А. Гурыновічы знешнепалітычная дзейнасць БССР дасягнула свайго піку як у галіне шматбаковай дыпламатыі, так і ў развіцці замежных сувязей з урадавымі і грамадскімі арганізацыямі замежных дзяржаў. З'явіліся новыя формы і метады знешнеэканамічнай дзейнасці, якая ажыццяўлялася праз агульнасаюзныя знешнегандлёвыя органы і з дапамогай прыгранічнага гандлю. Сталі наладжвацца сувязі з суайчыннікамі за мяжой. На сесіях Генеральнай Асамблеі, якія праходзілі ў больш спрыяльных міжнародных умовах, дух канфрантацыі і палемікі стаў выцясняцца ў выступленнях беларускіх дыпламатаў выказваннямі на карысць дыялогу і кампрамісу. У цэлым дыпламатычны стыль беларускіх прадстаўнікоў «эпохі Гурыновіча» можна ацэньваць як традыцыйна-стрыманы або ўмерана кансерватыўны [3, с. 290–291].

Змяніліся ўнутраныя і знешнія ўмовы развіцця краіны і рэспублікі, што трансфармавалі формы і змест, стыль і метады працы беларускага МЗС, усёй знешнепалітычнай дзейнасці БССР. Кардынальныя змены адбыліся ў ліпені 1990 г., калі была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, а міністрам замежных спраў стаў П. Краўчанка. У наступныя паўтары гады Беларусь прайшла хуткі гістарычны шлях да незалежнасці, а беларускі адрад савецкай дыпламатыі ператварыўся, хоць пакуль толькі фармальна, у дыпламатычную службу новай незалежнай дзяржавы.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Кравченко П. К. Беларусь на распутье, или Правда о Беловежском соглашении. Записки дипломата и политика. М. : Время, 2006.
2. Киселев К. В. Записки советского дипломата. М. : Политиздат, 1974.
3. Снапковский В. Е. Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии. Минск : Право и экономика, 2021.
4. Гуринович А. Е. Участие Белорусской ССР в деятельности ООН. Минск : Беларусь, 1982.
5. Гуринович А. Е., Мартынов С. Н. 40 лет ООН и участие Белорусской ССР в ее деятельности: материал в помощь лектору. Минск : Знание, 1985.
6. За мир и сотрудничество между народами: Участие Белорусской ССР в 40-й сессии Генеральной Ассамблеи ООН / Сост. С. Н. Мартынов, вступит. ст. А. Е. Гуриновича (Основные итоги 40-й сессии Генеральной Ассамблеи ООН). Минск : Беларусь, 1986.
7. Снапкоўскі У. Е. Барацьба Беларускай ССР у ААН за мір і сацыяльны прагрэс (рэц.) // Весці Акад. навук Беларускай ССР. Сер. грамад. навук. 1988. № 1. С. 121–122.
8. Гуринович А. Е. Дипломатия Белоруссии // Международная жизнь. 1988. № 4. С. 62–70.

9. Снапковский В. Е. Белорусская ССР в ООН (1945–1985 гг.). Минск: Навука і тэхніка, 1985.
10. Снапковский В. Е. Путь Беларуси в ООН. 1944–1945 гг. Минск: Наука и техника, 1994.
11. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4 т. Т. 4 (4 ліпеня 1944 г. – 25 жніўня 1991 г.) / склад: А. Ф. Вялікі, У. Е. Снапкоўскі, А. В. Ціхаміраў, А. В. Шарапа. Мінск: Юніпак, 2015.
12. Архіў МЗС Рэспублікі Беларусь. Ф. 907. Воп. 1. Спр. 2425.
13. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дакументаў і матэрыялаў у 10 т. Т. 6 (1976 г. – верасень 1991 г.) / склад.: У. К. Ракашэвіч, А. В. Шарапа. Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2003.